УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА"

УДК 37.013.8

**МІХАЙЛАВА Алена Леанідаўна**

# ФАРМІРАВАННЕ МАРАЛЬНАГА І ФІЗІЧНАГА ЗДАРОЎЯ АСОБЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ: ГІСТОРЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

Аўтарэферат дысертацыі
на саісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук

Мінск – 2006

Работа выканана ва Установе адукацыі «Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя Пятра Міронавіча Машэрава»

**Навуковы кіраўнік:** доктар педагагічных навук, прафесар
**Арлова Ганна Пятроўна**
(Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава», кафедра сацыяльна-педагагічнай работы)

**Афіцыйныя апаненты:** доктар педагагічных навук, прафесар
**Глазырына Ларыса Дмітрыеўна**
(Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка», кафедра педагогікі вышэйшай школы і сучасных выхаваўчых тэхналогій)

кандыдат педагагічных навук, дацэнт
**Павільч Аляксандр Аляксандравіч**
(Установа адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт», кафедра культуралогіі)

Апаніруючая арганізацыя – Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

Абарона адбудзецца 5 снежня 2006 года ў 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.21.02 пры Установе адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка» па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, д. 18, ауд. 482, тэл. 226-56-23.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка».

Аўтарэферат разасланы __ лістапада 2006 года.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый Д 02.21.02 А.І. Андарала

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць даследавання:**

Праблема ўзаемасувязі працэсаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы надзвычай актуалізавалася ў сучасны перыяд развіцця інфармацыйнага грамадства: наступствы аварыі на Чарнобыльскай АЭС, экалагічныя і тэхнагенныя катастрофы Сусвету, а таксама засілле заходняй субкультуры значным чынам пагоршылі маральнае і фізічнае здароўе нацыі. Усе вышэйзгаданыя фактары прывялі да пагаршэння стану здароўя беларусаў, скарачэння працягласці іх жыцця, маральнай дэградацыі пэўнай часткі грамадства, трансфармацыі жыццёвых каштоўнасцей і ідэалаў моладзі.

Мэтанакіраванае фарміраванне маральна і фізічна здаровай асобы беларускай моладзі патрабуе гісторыка-педагагічнага абгрунтавання яе стратэгіі. Гістарычныя традыцыі беларускага народа ў сферы фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы, што складаюць аснову народнай педагогікі, павінны арганічна ўваходзіць у сучасныя ўяўленні аб чалавеку як гаспадару і творцу ўласнага здароўя. Ва ўсе часы народная педагогіка мела на мэце выхаванне здаровага, моцнага, працавітага чалавека і назапасіла шматвяковы станоўчы вопыт па фарміраванні маральна і фізічна здаровай асобы праз сістэму народна-педагагічных сродкаў і метадаў, праз традыцыі сямейнага і грамадскага выхавання, што склаліся ў працэсе гістарычнага жыцця. Выхаваўчы патэнцыял беларускай народнай педагогікі можа быць накіраваны на ўзбагачэнне сямейнага і грамадскага выхавання, што ў выніку дапаможа фарміраванню нацыянальна вызначанай маральна і фізічна здаровай асобы, здольнай жыць у суладдзі з нацыянальна-культурным асяродкам.

Зварот да абранай тэмы абумоўлены пошукам шляхоў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы, што можа эфектыўна паслужыць мэце фарміравання маральна і фізічна здаровага падрастаючага пакалення сучасных беларусаў.

Вылучаючы храналагічны перыяд даследавання, мы звярнуліся да аналізу народнай педагогікі канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Беларуская народная педагогіка менавіта ў дадзены гістарычны перыяд русіфікацыі насельніцтва Беларусі была амаль што адзіным сродкам выхавання і адукацыі на роднай мове. З-за беднасці беларускай інтэлігенцыі не было выдаткаў на ўтрыманне беларускамоўных "тайных" школ (у дадзены перыяд існавалі "тайныя" руска-беларускія і польскія школы), таму адзіным захавальнікам беларускай народнай педагогікі быў беларускі селянін. Адметныя рысы нацыянальнага характару беларуса: працавітасць, талерантнасць, цярплівасць, эмацыянальная замкнёнасць, нешматслоўнасць – садзейнічалі захаванню традыцыйнага народна-педагагічнага выхаваўчага вопыту. Нацыянальна-дэмакратычная грамадскасць Беларусі ва ўмовах абвостранага канфлікту з саслоўна-класавай русіфікатарскай палітыкай самадзяржаўя адстойвала нацыянальныя інтарэсы ў галіне школьнай адукацыі. Меры па абрусенні краю сустракалі супраціўленне мясцовага насельніцтва: маці адмаўляліся аддаваць сваіх дзяцей у рускія школы. Дадзены перыяд уздыму нацыянальнай самасвядомасці беларусаў выклікае павышаную ўвагу асветнікаў к.XIX – п.XX стагоддзя да вывучэння мінулага беларускага народа, яго мовы, быту, фальклору: вывучэнне і прапаганда народнай

творчасці абуджае навуковую педагагічную думку і спрыяе пераемнасці народнай і навуковай педагогікі; асобнымі кнігамі выдаюцца фальклорна-этнаграфічныя зборы М.Дзмітрыева, М.Доўнар-Запольскага, А.Дэмбавецкага, Ю.Крачкоўскага, І.Насовіча, М.Нікіфароўскага, Е.Раманава, А.Семянтоўскага, П.Чубінскага, П.Шэйна і іншых.

Тэарэтычнай базай даследавання з'явіўся аналіз філасофскіх, валеалагічных, педагагічных, этнапедагагічных, этнаграфічных навуковых прац і артыкулаў, а таксама прац па беларускай народнай педагогіцы ў межах акрэсленай праблематыкі, у якіх:

- высвятляецца сутнасць паняццяў "народная педагогіка" і "этнапедагогіка" з пазіцыі нацыянальна-гістарычнага развіцця Беларусі (супрацоўнікі навукова-даследчай лабараторыі гісторыі адукацыі і этнапедагогікі Нацыянальнага інстытута адукацыі (1990-2001 г.г.): У.М. Конан, С.В. Снапкоўская);
- вызначаецца змест паняццяў "здароўе", "маральнае здароўе". "фізічнае здароўе" з мэтай усведамлення сутнасці працэсаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы (айчынны валеолаг Р.І. Купчынаў; расійскія валеолагі: Ю.А.Андрэеў, І.І. Брэхман, Ю.Ф. Зманоўскі, В.Б. Казначэеў, Б.М. Чумакоў);
- намячаюцца межы ўзаемадзеяння працэсаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы (айчынны педагог М.Б. Качаноўскі; расійскія педагогі: А.А.Дуброўскі, Б.Ц, Ліхачоў, Г.У. Мельнікаў, Т.А. Стэфаноўская);
- вызначаецца агульнанародны ідэал беларусаў (сучасныя даследчыкі беларускай народнай педагогікі: Г.П. Арлова. В.С. Болбас, В.У. Чэчат; асветнікі к. XIX – п.XX ст.ст.: М.В. Доўнар-Запольскі, Я. Колас, Я. Лучына, І.А. Сербаў, Цётка);
- аналізуецца ўклад асветнікаў к. XIX – п.XX стагоддзя ў вылучэнне, навуковае апісанне і фальклорнае напаўненне сродкаў і метадаў беларускай народнай педагогікі (А.Я.Багдановіч, У.М.Дабравольскі, М.В.Доўнар-Запольскі, Я.Ф.Карскі, Ю.Ф.Крачкоўскі, Я.Колас, Я.Лучына, А.М.Пыпін, Е.Р.Раманаў, І.А.Сербаў, А.К.Сержпутоўскі, М.Федароўскі, Цётка, П.В.Шэйн);
- разглядаецца пытанне маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (Г.П.Арлова, В.С.Болбас, А.А.Грымаць, А.Э.Крываносава, Л.В.Ракава);
- аналізуецца праблема фарміравання фізічнага здароўя падрастаючага пакалення праз звычаі і традыцыі, сродкі і метады народнай педагогікі (Г.П.Арлова, А.А.Грымаць, Л.В.Ракава).

Айчынны гісторык педагогікі С.В. Снапкоўская ўпершыню аналізуе стан развіцця народнай асветы і адукацыі ў перыяд к.XIX – п.XX ст.ст., вынікі грунтоўнага даследавання выяўляюцца ў шэрагу артыкулаў, манаграфіях: "Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі" (1995), "Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў к.XIX – п.XX ст.ст." (1998), калектыўнай манаграфіі "Народная педагогіка беларусаў" (1996), - дзе даследуецца ўплыў народнай педагогікі на развіццё педагагічнай думкі Беларусі, стан нацыянальнай школьнай адукацыі, магчымасці выкарыстання народнай педагогікі беларусаў вядомымі педагогамі-асветнікамі вышэйзгаданага перыяду ў вучэбна-выхаваўчым працэсе.

У.М.Конан – айчынны філосаф і культуролаг – з'яўляецца аўтарам тэорыі станаўлення і развіцця духоўных каштоўнасцей фальклору беларусаў (навуковае выданне "Ля вытокаў самапазнання: станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору"), упершыню ў айчыннай навуцы прапаноўвае гісторыка-метадалагічны

падыход да высвятлення сутнасці і ўзаемасувязі паняццяў "этнапедагогіка" і "этнічная культура" (калектыўная манаграфія "Народная педагогіка беларусаў").

Даследчыкам беларускай народнай педагогікі стала Г.П. Арлова, якая выдала навуковую працу "Беларуская народная педагогіка" (1993). У ёй вызначаны маральны і фізічны ідэал беларускага народа, раскрыта сутнасць асноўных відаў выхавання, распрацаваных педагагічным геніем народа, разглядаюцца народна-педагагічныя сродкі і метады ў выхаванні беларускім народам падрастаючага пакалення. Пытанні аб сутнасці маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы, існавання пераемнай сувязі паміж народнай і навуковай педагогікай закранаюцца Г.П. Арловай у наступных выданнях: "Народная педагогіка як фактар развіцця тэорыі маральнага выхавання" (1996). "Этнапедагогіка: тэорыя маральнага выхавання" (2001), манаграфіі "Пераемнасць народнай і навуковай педагогікі ў развіцці тэорыі маральнага выхавання" (2000).

Айчынны даследчык В.С. Болбас дасканала даследаваў праблему маральнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў. з'яўляецца аўтарам шэрагу навуковых артыкулаў, кніг "Этычная педагогіка беларусаў" (2004), "Этыка-педагагічная думка Беларусі (са старажытнасці да XVIII ст.)" (2004), у якіх пададзены тэарэтыка-метадалагічны падыход да даследавання этычных аспектаў народнай педагогікі беларусаў, гістарыяграфія развіцця этычнай думкі ў Беларусі, пачынаючы са старажытнасці да XVIII стагоддзя).

Л.В. Ракава прысвяціла шэраг навуковых артыкулаў і кнігу "Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы" (2000) даследаванню сутнасці сямейнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў.

Магчымасці выкарыстання беларускіх народна-педагагічных традыцый у сучасным маральным выхаванні паказаў А.А. Грымаць (калектыўныя выданні: "Народная педагогіка беларусаў", "Беларуская народная педагогіка: тэорыя і практыка").

Вышэйзгаданыя айчынныя навукоўцы распрацоўвалі пытанні тэарэтыка-метадалагічнага падыходу да вывучэння беларускай народнай педагогікі (аспектаў маральнага, фізічнага, сямейнага выхавання; фенамену маральнага і фізічнага ідэалу беларускага народа, тэарэтычнага вывучэння фальклору беларусаў і г.д.) У той жа час грунтоўнага даследавання па праблеме фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы не назіраецца. Усё гэта абумовіла мэтазгоднасць звяртання да вызначанай праблемы.

Неабходнасць даследавання дадзенай праблемы тлумачыцца наступнымі супярэчнасцямі:

- паміж недахопам навуковых ведаў па прымяненні беларускай народнай педагогікі ў працэсе фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы і зместам мэтавай дзяржаўнай праграмы "Выхаванне дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь на 2000-2005 г.г." (у якасці новай выхаваўчай парадыгмы закладзена ўстаноўка на роўнасць розных відаў сацыяльна прымальнага выхаваўчага вопыту, у тым ліку выхавання на народных традыцыях, а таксама выкарыстанне ў выхаванні народнай педагогікі беларусаў);
- паміж вострай патрэбай выхаваўчых інстытутаў у выкарыстанні народных педагагічных традыцый у галіне маральнага і фізічнага аздараўлення дзяцей і моладзі і недастатковым даследаваннем метадалагічнай базы народна-

педагагічных ведаў па азначанай праблеме, - што ў выніку робіць малаэфектыўным прымяненне беларускай народнай педагогікі ў тэорыі і практыцы фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы.

Такім чынам, вышэйпададзеныя акалічнасці прадвызначылі выбар тэмы дысертацыйнага даследавання: **"Фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы: гісторыка-метадалагічны аспект".**

***Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі***

Дысертацыйная работа выконвалася ў межах мэтавай дзяржаўнай праграмы "Выхаванне дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь на 2000-2005 г.г." (№ дзярж.р. 20000 2117), а таксама – навукова-даследчыцкай лабараторыі кафедры сацыяльна-педагагічнай работы УА "Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М.Машэрава" "Прафесійнае майстэрства спецыялістаў сацыяльнай і адукацыйнай сфер" (зацверджанай 26 сакавіка 2004 года, пратакол № 9 пасяджэння Савета УА "ВДУ імя П.М. Машэрава").

***Мэта даследавання:*** на аснове аналізу фальклорных, этнакультурных, гісторыка-архіўных крыніц і навуковай літаратуры па праблеме даследавання выявіць і ахарактарызаваць шляхі і сродкі фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы, а таксама прасачыць узаемасувязь дадзеных працэсаў.

***Задачы даследавання:***

1) вызначыць і размежаваць паняцці "народная педагогіка" і "этнапедагогіка" з улікам нацыянальна-гістарычнай спецыфікі;

2) удакладніць і прадставіць у цэласным выглядзе характэрны для беларусаў ідэал маральна і фізічна здаровай асобы на падставе разгляду педагагічных поглядаў, тэорый, меркаванняў вядомых беларускіх асветнікаў к.XIX – п.XX ст.ст., а таксама мэтанакіраванага аналізу вуснай народнай творчасці беларусаў;

3) вызначыць шляхі фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы, а таксама нацыянальна-гістарычную своеасаблівасць беларускіх народна-педагагічных сродкаў і метадаў, распрацаваўшы іх аўтарскую класіфікацыю;

4) раскрыць узаемасувязь працэсаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы;

5) паказаць магчымасці прымянення выхаваўча-аздараўленчага патэнцыялу беларускай народнай педагогікі ў вырашэнні праблемы фарміравання маральна і фізічна здаровага падрастаючага пакалення беларусаў.

***Аб'ект даследавання***: беларуская народная педагогіка.

***Прадмет даследавання:*** фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы.

***Метадалогія і метады праведзенага даследавання.***

<u>Філасофска-метадалагічнай базай даследавання з'яўляюцца:</u>

- культуралагічны падыход да вызначэння ролі фальклору як першаасновы ў станаўленні і пазнанні духоўных каштоўнасцей народнай педагогікі беларусаў (У.М.Конан);

- гісторыка-метадалагічнае абгрунтаванне звароту да нацыянальных вытокаў духоўнасці (А.С. Майхровіч, С.В. Снапкоўская);
- нацыянальна-гістарычнае даследаванне фарміравання беларускай народнасці і нацыі (В.К. Бандарчык, С.Ф. Дубянецкі, А.С.Майхровіч);
- распрацоўка працэсу ўсведамлення асобай ідэалу праз вырашэнне шэрагу супярэчнасцей (М.Ф. Калашнікаў).

<u>Агульнанавуковую аснову даследавання складаюць:</u>
- ідэі ўліку ўзроставых асаблівасцей у працэсе выхаваўчага ўздзеяння (У.У.Багаслоўскі, Л.І. Бажовіч, Л.С. Выгоцкі, А.М. Лявонцьеў, А. Касакоўскі, Д.Б.Эльконін і інш.);
- тэорыя пра выхаванне асобы як мэтанакіраваны працэс, што прадугледжвае шэраг этапаў і праверку канчатковага выніку (У.У.Багаслоўскі, Л.І. Бажовіч, Л.С.Выгоцкі, А. Касакоўскі, Л.І. Рувінскі, І.І. Харламаў і інш.);
- асобасна-дзейная пазіцыя ў адносінах да ўласнага здароўя, узгодненая з аўтарскімі "Я"-канцэпцыямі" ( А.І.Кочатаў, С.В.Папоў, Б.М. Чумакоў);
- гісторыка-метадалагічны падыход да высвятлення сутнасці і ўзаемасувязі паняццяў "этнапедагогіка" і "этнічная культура", што выкарыстоўваецца пры правядзенні аналізу фенамену этнічнай і народнай педагогікі (У.М. Конан).

<u>Канкрэтна-навуковую аснову даследавання склалі:</u>
- працы даследчыкаў гісторыі і культуры Беларусі – супрацоўнікаў навукова-даследчай лабараторыі гісторыі адукацыі і этнапедагогікі Нацыянальнага інстытута адукацыі (1990-2001 г.г.), – у якіх вызначаецца сутнасць паняццяў "народная педагогіка" і "этнапедагогіка" (У.М. Конан. С.В. Снапкоўская);
- даследчыцкія працы па беларускай народнай педагогіцы, звязаныя з праблемай выкарыстання народна-педагагічнага вопыту ў працэсе маральнага і фізічнага выхавання асобы (Г.П. Арлова, В.С. Болбас, А.А. Грымаць, А.Э. Крываносава, Л.В.Ракава, С.В. Снапкоўская і інш.);
- фундаментальныя даследаванні сутнасці маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (Г.П.Арлова, В.С.Болбас, А.А.Грымаць, А.Э.Крываносава, Л.В.Ракава);
- працы даследчыкаў па праблеме фарміравання фізічнага здароўя падрастаючага пакалення праз звычаі і традыцыі, сродкі і метады народнай педагогікі (Г.П.Арлова, А.А.Грымаць, Л.В.Ракава).
- даследаванні вучоных-валеолагаў па ўдакладненні сутнасці паняццяў "здароўе", "маральнае здароўе", "фізічнае здароўе" (Ю.А. Андрэеў, І.І. Брэхман, Ю.Ф.Зманоўскі, В.Б. Казначэеў, Р.І. Купчынаў. Б.М. Чумакоў);
- псіхолага-педагагічныя працы па праблеме ўзаемаабумоўленасці здароўя дзіцяці з яго ўнутранай эмацыянальнай сферай (Л.І. Бажовіч, Л.С. Выгоцкі, А.А.Дуброўскі, М.Б. Качаноўскі, Б.Ц. Ліхачоў. Г.У. Мельнікаў, Д.Б.Эльконін і іншыя).

Для паспяховага вырашэння пастаўленых задач быў выкарыстаны комплекс узаемадапаўняльных <u>метадаў даследавання</u>: апісальна-аналітычнага, параўнальна-гістарычнага, тэарэтычнага, што знайшлі сваё адлюстраванне ў параўнальным аналізе і абагульненні філасофскіх, валеалагічных, педагагічных, этнапедагагічных, народна-педагагічных, этнаграфічных звестак у кантэксце тэмы даследавання. Дадзеныя

метады рэалізуюцца праз сістэму навукова-даследчыцкіх прыёмаў, такіх як збор матэрыялаў народнай творчасці беларусаў, функцыянальны аналіз, інтэрпрэтацыя, супастаўленне, сістэматызацыя і класіфікацыя.

***Навуковая навізна і тэарэтычная значнасць атрыманых вынікаў.***

Упершыню ў айчыннай гісторыі педагогікі пры вызначэнні і размежаванні паняццяў "народная педагогіка" і "этнапедагогіка" распрацаваны гісторыка-метадалагічны падыход і ўлічана нацыянальна-гістарычная спецыфіка; паказаны магчымасці прымянення выхаваўча-аздараўленчага патэнцыялу беларускай народнай педагогікі ў вырашэнні праблемы фарміравання маральна і фізічна здаровага падрастаючага пакалення беларусаў; раскрыта ўзаемасувязь працэсаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы, якая выяўляецца праз:

- характэрны для беларусаў ідэал маральна і фізічна здаровай асобы, вылучаны на падставе разгляду педагагічных поглядаў, тэорый, меркаванняў вядомых беларускіх асветнікаў к.XIX – п.XX ст.ст., а таксама мэтанакіраванага аналізу вуснай народнай творчасці беларусаў;
- агульную сістэму народна-педагагічных сродкаў і метадаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы;
- узаеманакіраваны характар працэсаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы, што ўключаюць характэрныя шляхі і сродкі.

Распрацавана аўтарская класіфікацыя:

- народна-педагагічных сродкаў, якая змяшчае два блокі, што аб'ядноўваюць спрадвечна беларускія сродкі народнай педагогікі ў залежнасці ад выхаваўчага накірунку: практычны блок (праца, гульня) і этнакультурны блок, што ў сваю чаргу падзяляецца на моўны падблок (казкі, міфы і паданні, прыказкі, прымаўкі і фразеалагізмы, песні, пацешкі і забаўлянкі, анекдоты і жарты) і традыцыйна-побытавы (звычаі і традыцыі);
- метадаў беларускай народнай педагогікі, што маюць на мэце фарміраванне маральна і фізічна здаровай асобы, згрупаваныя па прымеце выходнай ініцыятывы: метады ініцыятывы "акружэнне "Я" (прыклад і аўтарытэт, наказ, благаславенне, перакананне, парада, прывучэнне, унушэнне, тлумачэнне, распowед, грамадская думка, ушчуванне, заахвочванне, ухваленне, асуджэнне, вымова, пакаранне, пагроза, праклён); метады ініцыятывы "Я" (назіранне; самаўнушэнне, самапераконанне, самапрывучэнне, самазаахвочванне, самаўшчуванне, самаўхваленне, самаасуджэнне, самапакаранне); метады ўзаемнай ініцыятывы (праца, гульня, іспыт, практыкаванне, гутарка, спаборніцтва).

***Практычная (эканамічная, сацыяльная) значнасць атрыманых вынікаў.***

Даследаванне можа быць выкарыстана ў галіне фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы сістэмы бесперапыннай адукацыі і выхавання: у сямейным выхаванні, самавыхаванні, у вучэбна-выхаваўчым працэсе дзіцячых садкоў і школ, пры падрыхтоўцы будучых спецыялістаў адукацыйнай і сацыяльнай сфер у межах курсаў па этнапедагогіцы, валеалогіі, сацыяльнай педагогіцы, у сістэме павышэння кваліфікацыі спецыялістаў вышэйзгаданых сфер дзейнасці.

Сацыяльна-эканамічная значнасць атрыманых вынікаў заключаецца ў тым, што іх выкарыстанне ў выхаваўчым працэсе сістэмы бесперапыннай адукацыі спрыяе фарміраванню маральна і фізічна здаровай асобы ў інтарэсах устойлівага развіцця грамадства, што аказвае дабратворны ўплыў не толькі на асобу, але і на соцыум.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, што выносяцца на абарону:**

1. ***Распрацаваны гісторыка-метадалагічны падыход да вызначэння і размежавання паняццяў "народная педагогіка" і "этнапедагогіка" з улікам асаблівасцей нацыянальна-гістарычнага кантэксту.*** Здабыткі выхаваўчай спадчыны і этнічнай культуры насельніцтва гістарычнай тэрыторыі Беларусі да другой паловы XIX стагоддзя справядліва вызначаць як этнічную педагогіку, пад якой мы разумеем выхаваўчыя традыцыі асобнай этнічнай групы, што складваліся ў перыяд яе станаўлення. Пачынаючы з другой паловы XIX стагоддзя (часу гістарычнага фарміравання беларускай нацыі) народную педагагічную спадчыну беларусаў неабходна іменаваць беларускай народнай педагогікай – бесперапынным працэсам стварэння, удасканалення і перадачы ў спадчыну педагагічных ідэй і выхаваўчай практыкі беларускага народа, занатаваных у яго народнай творчасці.

2. ***Удакладнены і пададзены ў цэласным выглядзе характэрныя для беларускага народа к.XIX–п.XX ст.ст. ідэал маральна і фізічна здаровай асобы.*** Сукупны ідэал маральна і фізічна здаровай асобы ўключае ў сябе найбольш адметныя рысы: працавітасць, патрыятызм, гуманізм, дабрыню, чэснасць і праўдзівасць, сумленнасць, павагу да людзей, гонар і ўласную годнасць, фізічную моц і вытрымку, упэўненасць, справядлівасць. Доказнасць і аргументаванасць вылучэння вышэйзгаданага ідэалу вызначаецца прымяненнем гісторыка-метадалагічнага падыходу да вывучэння навуковай спадчыны беларускіх асветнікаў к.XIX–п.XX ст.ст.: М.Доўнар-Запольскага, Я. Коласа, Я.Лучыны, І.Сербава, Цёткі, - а таксама мэтанакіраванага аналізу вуснай народнай творчасці беларусаў на прадмет удакладнення нацыянальна вызначаных рыс маральна і фізічна здаровай асобы.

3. ***Вызначана нацыянальная адметнасць сродкаў і метадаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы***, што дазволіла распрацаваць іх аўтарскую класіфікацыю. ***Народна-педагагічныя сродкі*** аб'ядноўваюцца ў два блокі ў залежнасці ад выхаваўчага накірунку: практычны (праца, гульня) і этнакультурны, што ў сваю чаргу падзяляецца на моўны падблок (казкі, міфы і паданні, прыказкі, прымаўкі і фразеалагізмы, песні, пацешкі і забаўлянкі, анекдоты і жарты) і традыцыйна-пабытавы (звычаі і традыцыі). ***Метады беларускай народнай педагогікі***, што маюць на мэце фарміраванне маральна і фізічна здаровай асобы, падзяляем па прымеце выхаднай ініцыятывы, г. зн. выхаваўчага ўплыву на асобу ўласна асобай або яго акружэннем (сям'я, сябры, калегі па працы, суседзі, вяскоўцы), на наступныя групы: метады ініцыятывы "акружэнне "Я" (прыклад і аўтарытэт, наказ, благаславенне, перакананне, парада, прывучэнне, унушэнне, тлумачэнне, расповед, грамадская думка, ушчуванне, заахвочванне, ухваленне, асуджэнне, вымова, пакаранне, пагроза, праклён); метады ініцыятывы "Я" (назіранне: самаўнушэнне, самаперакананне, самапрывучэнне, самазаахвочванне,

самаўшчуванне, самаўхваленне, самаасуджэнне, самапакаранне); метады ўзаемнай ініцыятывы (праца, гульня, іспыт, практыкаванне, гутарка, спаборніцтва). ***Фарміраванне маральнага здароўя асобы ў беларусаў, абумоўленае нацыянальнымі асаблівасцямі і прасякнутае народна-педагагічнымі сродкамі і метадамі, з'яўлялася паслядоўным працэсам***, што быў узгоднены з полаўзроставымі асаблівасцямі і складаўся з наступных узаемаабумоўленых этапаў: 1) фарміраванне маральнай свядомасці (маральных уяўленняў і паняццяў, маральных пачуццяў, маральнай ацэнкі); 2) фарміраванне маральнага мыслення; 3) фарміраванне маральных паводзін; 4) фарміраванне маральнай волі (адбывалася на кожным з адзначаных этапаў фарміравання маральнага здароўя асобы). ***Працэс фарміравання фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы скіраваны на захаванне і ўмацаванне здароўя дзіцяці, дадзенага яму ад нараджэння.*** Паспяховасць дадзенага працэсу залежыць ад наступных сацыяльных умоў і сродкаў: спадчыннасці, умоў працякання цяжарнасці будучай маці, мерапрыемстваў па асептыцы падчас прыняцця родаў, рацыянальнага рэжыму дня, у тым ліку працы і адпачынку; аздараўленчай фізкультуры і актыўнага адпачынку; загартавання; рацыянальнага харчавання; гігіены асабістай і гігіены быту; станоўчай накіраванасці на непрыняцце альбо адмову ад шкодных звычак.

4. ***Даказана ўзаемасувязь працэсаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы,*** што выяўляецца праз: 1) адзіны для іх ідэал маральна і фізічна здаровай асобы; 2) агульны спектр сродкаў і метадаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы; 3) узаеманакіраваны характар працэсаў, што вызначана наяўнасцю элементаў фарміравання фізічнага здароўя асобы ў працэсе фарміравання маральнага здароўя асобы і, адпаведна, прысутнасцю кампанентаў фарміравання маральнага здароўя ў працэсе фарміравання фізічнага здароўя асобы.

5. ***Пададзены магчымасці вырашэння праблемы фарміравання маральнага і фізічнага здароўя падрастаючага пакалення сучасных беларусаў*** пры звяртанні сучасных адукацыйных устаноў Беларусі да нацыянальных вытокаў і стратэгічным выкарыстанні выхаваўча-аздараўленчага патэнцыялу беларускай народнай педагогікі ў планаванні і рэалізацыі выхаваўчага працэсу: 1) выбар выхаваўчых арыенціраў згодна са спецыфікай нацыянальнага характару і ментальнасці беларускага народа, а таксама з улікам агульнанароднага маральнага і фізічнага ідэалу; 2) мэтанакіраванае выкарыстанне сродкаў і метадаў беларускай народнай педагогікі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе навучальных устаноў, сямейным і грамадскім выхаванні (спецыяльная падрыхтоўка будучых педагогаў; метадычнае кансультаванне бацькоў; правядзенне тэматычных лекцый для шырокага кола грамадскасці); 3) планаванне здаровага ладу жыцця асобы пры выкарыстанні беларускіх народных традыцый фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы; 4) фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя падрастаючага пакалення ва ўзаемасувязі.

***Асабісты ўклад саіскальніка.*** Праца з'яўляецца самастойным навуковым даследаваннем, якое поўнасцю выканана аўтарам.

***Апрабацыя вынікаў дысертацыйнага даследавання:***

- ажыццяўлялася ў працэсе абмеркавання на кафедры педагогікі УА "Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава", а таксама на міжнародных і рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцыях: Общеобразовательная школа в условиях реформирования: состояние и перспективы. Международная научно-практическая конференция. Витебск, 2002; Мир искусства и дети: проблемы художественной педагогики. 2 международная научно-практическая конференция. Витебск, 2001; Новые технологии в современном процессе обучения. 1 Республиканская научно-практическая конференция. Новополоцк, 2003; Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія. 5 міжнародная навуковая канферэнцыя. Віцебск, 2000; Гуманизация и духовность в образовании и воспитании: научно-практическая конференция.Смоленск, 2002; Беларусь и Европа: взаимодействие культур (история, уроки, опыт, современность). Международная научно-практическая конференция. Витебск, 2000; Германский и славянский миры: взаимовлияние, конфликты, диалог культур (история, уроки, опыт, современность). Международная научно-теоретическая конференция. Витебск, 2001; Наука и образование в условиях социально-экономической трансформации общества. Международная научная конференция. Витебск, 2001; Профессиональная подготовка специалистов социальной и образовательной сфер в условиях трансформации современного общества: проблемы и перспективы. Международная научно-практическая конференция. Витебск, 2005;
- мела месца: у выхаваўчай рабоце дзіцячага садка №35 г.Віцебска; пры распрацоўцы і правядзенні вучэбнага курса «Этнапедагогіка» для студэнтаў ФСПіП УА «ВДУ імя П.М. Машэрава»; у рабоце студэнцкага навуковага гуртка «Народная педагогіка» пры кіраванні студэнцкімі курсавымі і дыпломнымі працамі.

***Апублікаванасць вынікаў.*** Матэрыялы даследавання знайшлі сваё выяўленне ў 16 публікацыях аўтара (1 вучэбна-метадычным дапаможніку, 5 навуковых артыкулах у часопісах, 10 матэрыялах і тэзісах міжнародных навуковых і навукова-практычных канферэнцый). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў склаў 72 старонкі.

***Структура і аб'ём дысертацыі.*** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, дзвюх глаў (Глава 1 – "Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання праблемы фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы". Глава 2 – "Шляхі і сродкі фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы"), заключэння, спіса выкарыстаных крыніц, дадатка. Поўны аб'ём тэкставай часткі дысертацыі складае 106 старонак, з уключэннем 6 табліц і 6 логіка-структурных схем, што займаюць 18 старонак. Спіс выкарыстаных крыніц складаецца з 284 найменняў на рускай і беларускай мовах.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

У першай главе **"Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання праблемы фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы"** вызначана сутнасць паняццяў "народная педагогіка" і "этнапедагогіка" ў нацыянальна-гістарычным праламленні. Улічваючы навуковыя пазіцыі У.М. Конана, С.Ф. Дубянецкага і А.С. Майхровіча, што вызначылі гістарычныя канцэпцыі фарміравання беларускай народнасці і нацыі, мы прыйшлі да высновы, што справядліва вызначаць здабыткі выхаваўчай спадчыны і этнічнай культуры насельніцтва, што пражывала на гістарычнай тэрыторыі Беларусі ў перыяд да другой паловы XIX стагоддзя, як <u>этнічную педагогіку</u>, пад якой мы разумеем выхаваўчыя традыцыі асобнай этнічнай групы, што складваліся ў перыяд яе станаўлення. Пачынаючы з другой паловы XIX стагоддзя (часу пачатку гістарычнага фарміравання беларускай нацыі) народную педагагічную спадчыну неабходна іменаваць <u>беларускай народнай педагогікай</u>. Дадзенае паняцце, зыходзячы з уласных даследчыцкіх пазіцый, ёсць бесперапынны працэс стварэння, удасканалення і перадачы ў спадчыну педагагічных ідэй і выхаваўчай практыкі беларускага народа, занатаваных у яго народнай творчасці. Разгледжана сутнасць паняццяў "маральнае здароўе" і "фізічнае здароўе" на аснове аналізу навуковых канцэпцый вядучых валеолагаў на постсавецкай прасторы: Ю.А.Андрэева, М.М.Амосава, І.І.Брэхмана, Ю.Ф.Зманоўскага, В.П.Казначэева, Р.І.Купчынава, С.В. Папова, Б.М. Чумакова). Шэраг сучасных педагогаў даследуюць , грані ўзаемасувязі і ўзаемадзеяння фізічнага і маральнага здароўя чалавека, сярод якіх Г.У. Мельнікаў (цэласны падыход да чалавека як адзінства арганізма і асобы), М.Б.Качаноўскі (далучэнне падрастаючага пакалення да здаровага ладу жыцця праз выкарыстанне асноўных напрамкаў валеапедагогікі), А.А. Дуброўскі (падтрыманне здароўя дзяцей з дапамогай станоўчых эмоцый і радасці) і іншыя. Грунтоўныя даследаванні па беларускай народнай педагогіцы, прадстаўленыя Г.П.Арловай, В.С.Болбасам, А.А.Грымацем, Л.М.Варанецкай, А.Э.Крываносавай, Л.В.Ракавай, С.В.Снапкоўскай, сведчаць пра шырокія магчымасці выкарыстання выхаваўчага вопыту народнай педагогікі беларусаў у практыцы сучаснай сістэмы выхавання падрастаючага пакалення, якая, дзякуючы сістэме пераемнасці, устойлівасці нормаў і правіл паводзін у грамадстве, дапамагае ўсвядоміць выхаванцу агульначалавечыя маральныя каштоўнасці, ідэал народа, а значыць спрыяе выхаванню высокамаральнай і фізічна здаровай асобы. Вядомыя беларускія асветнікі канца XIX – пачатку XX стагоддзяў: А.Я.Багдановіч, Я.Колас, В.Ластоўскі, Цётка (А.С.Пашкевіч) – абапіраліся ў сваёй прафесійнай дзейнасці на народна-педагагічныя ідэі, узбагачаючы беларускую школу і педагагічную думку новымі метадычнымі распрацоўкамі і педагагічнымі знаходкамі. Вынікі іх навуковых пошукаў і даследаванняў народнай творчасці знайшлі сваё выяўленне ў фундаментальных зборах вуснанародных твораў, слоўніках беларускай мовы.

Паказаны ўплыў на крышталізацыю беларускага нацыянальнага характару этнагенезу беларусаў, прыродна-геаграфічных і геапалітычных фактараў, нацыянальнай псіхалогіі і менталітэту беларусаў. Ідэал маральна і фізічна здаровай асобы шліфаваўся на працягу вякоў, што зафіксавана ў творах беларускіх асветнікаў ад эпохі Рэнесансу да другой паловы XIX ст. Ідэал маральна і фізічна здаровай асобы

канчаткова ўтрымаўся ў к.XIX – п.XX ст.ст., аб чым сведчаць айчынныя асветнікі дадзенага перыяду: Ф.Багушэвіч, Я.Лучына, Цётка, Я.Колас, І.Я.Сербаў, М.В.Доўнар-Запольскі. У беларускай народнай педагогіцы магчыма вылучыць сукупны ідэал маральна і фізічна здаровай асобы, які ўключае ў сябе найбольш адметныя рысы: працавітасць, патрыятызм, гуманізм, дабрыню, чэснасць і праўдзівасць, сумленнасць, павагу да людзей, гонар і ўласную годнасць, фізічную моц і вытрымку, упэўненасць, справядлівасць. З мэтай вылучэння вышэйзгаданага ідэалу быў выкарыстаны гісторыка-метадалагічны падыход да вывучэння навуковай спадчыны беларускіх асветнікаў к.XIX – п.XX ст.ст., а таксама мэтанакіраваны аналіз вуснай народнай творчасці беларусаў на прадмет удасканалення нацыянальна вызначаных рыс маральна і фізічна здаровай асобы.

Значны ўклад быў зроблены вучонымі-этнографамі, педагогамі канца XIX – пачатку XX стагоддзяў: А.Я.Багдановічам, М.В. Доўнар-Запольскім, Я.Ф.Карскім, Ю.Ф.Крачкоўскім, М.Я.Нікіфароўскім, А.М.Пыпіным, Е.Р.Раманавым, А.К.Сержпутоўскім, М.Федароўскім, П.В.Шэйнам – у захаванне народна-выхаваўчай спадчыны нашых продкаў, дзякуючы збору і запісам вуснай народнай творчасці, звычаяў, святаў і абрадаў беларускага народа, апісанню і сістэматызацыі народна-педагагічных сродкаў і метадаў, якія з'яўляюцца неад'емным метадалагічным апаратам пры фарміраванні маральна і фізічна здаровай асобы ў беларускай народнай педагогіцы.

Арсенал беларускай народнай педагогікі змяшчае шэраг нацыянальна адметных выхаваўчых сродкаў, што гістарычна склаліся на тэрыторыі Беларусі, змест, напаўненне і метадычны сэнс якіх абумоўлены асаблівасцямі ладу жыцця, побыту, традыцый беларусаў. Распрацавана аўтарская класіфікацыя сродкаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы, якая складаецца з наступных двух блокаў:

1) практычнага (праца і гульня – прывучаюць з маленства да выканання ўсіх этычных правілаў і нормаў, прынятых у грамадстве, садзейнічаюць мэтанакіраванай штодзённай фізічнай падрыхтоўцы дзяцей і моладзі);

2) этнакультурнага, які ў сваю чаргу падзяляецца на 2 падблокі: моўны (прыказкі і прымаўкі, песні, казкі, прыкметы і павер'і, пацешкі і забаўлянкі, анекдоты і жарты – дапамагаюць фарміраванню маральнага і фізічнага здароўя асобы славесным уздзеяннем на пачуцці і свядомасць падрастаючага пакалення з боку дарослых) і традыцыйна-побытавы (звычаі і традыцыі – далучаюць да традыцыйных для беларускага народа звычаяў і святаў).

Народ выпрацаваў на працягу свайго гістарычнага развіцця шэраг метадаў, што здольныя сфарміраваць здаровую ў маральных і фізічных адносінах асобу. Распрацавана іх аўтарская класіфікацыя <u>па прызнаку выхаднай ініцыятывы</u> ў фарміраванні маральнага і фізічнага здароўя асобы:

1. Метады ініцыятывы "акружэнне "Я"": прыклад і аўтарытэт, наказ, перакананне, парада, прывучэнне, унушэнне, тлумачэнне, распавед, грамадская думка, заахвочванне і ўхваленне, асуджэнне і ўшчуванне, благаславенне, пакаранне, вымова, пагроза, праклён (мэта: выпрацаваць у дзіцяці разуменне значэння той якасці, якую яму імкнуцца прывіць; фарміраваць яго маральныя паняцці, перакананні і пачуцці).

2. Метады ініцыятывы "Я": назіранне; (у залежнасці ад узросту асобы, што фарміруецца, узроўня сфарміраванасці яе валявых якасцей, мэтанакіраванасці, сталасці яе матывацыйнай сферы некаторыя метады ініцыятывы "акружэнне "Я"

могуць пераходзіць у дадзеную групу з прыстаўкай *сама-*): самаўнушэнне, самаперакананне, самапрывучэнне, самаўшчуванне, самаўхваленне, самаасуджэнне, самапакаранне (мэта: выхоўваць у асобы адказныя адносіны да сябе, да фарміравання ўласнага маральнага і фізічнага здароўя, успрыманне сябе як асобы).

3. Метады ўзаемнай ініцыятывы: гутарка, спаборніцтва, праца, гульня, іспыт, практыкаванне (мэта: фарміраваць свядомасць і пэўны тып паводзінаў у грамадстве).

У другой главе **"Шляхі і сродкі фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы"** пададзены шляхі фарміравання маральнага і фізічнага здароўя ад нараджэння дзіцяці да ўступлення яго ў дарослае жыццё.

Для ўсвядамлення працэса **фарміравання маральнага здароўя** асобы, неабходна ахарактарызаваць яго вынік, а менавіта **маральна здаровую асобу**, якой, на наша меркаванне, з'яўляецца высокамаральны чалавек, з вызначанай сістэмай агульначалавечых каштоўнасцей, установак і матываў паводзін у грамадстве. Мэтанакіраваны, паступовы працэс фарміравання маральнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы складаецца з 3-х паслядоўных і ўзаемаабумоўленых этапаў: маральнай свядомасці, маральнага мыслення і маральных паводзін, - а таксама з маральнай волі, якая забяспечвае эфектыўнасць праходжання асобай, што фарміруецца, кожнага з вышэйзгаданых этапаў і дазваляе ёй дасягнуць пастаўленай мэты. Дадзены працэс мае месца ў кожным узроставым перыядзе ад блазнюковага да юнацкага, "анёлкавы" узрост з'яўляецца падрыхтоўчым да актывізацыі працэсу фарміравання маральнага здароўя.

**Маральная свядомасць**, у сваю чаргу, складаецца з шэрагу падэтапаў, размешчаных згодна з пэўнай ступенню актывізацыі ўнутраных механізмаў асобы, што ўплываюць на дадзены працэс: маральных уяўленняў і паняццяў, такіх як "дабро", "павага", "сумленнасць", "гасціннасць", "сціпласць", "гаспадарлівасць", а таксама "зло", "знявага", "бессаромнасць", "крывадушша", "зазнайства", "лянота" і інш.; маральных пачуццяў (пачуцця гуманізму, дружбы, таварыскасці, любові да бацькоў, да Радзімы, кахання, пачуцця ўласнай годнасці, сумлення, справядлівасці і інш.); маральнай ацэнкі, што фарміруюцца падчас калектыўнай дзейнасці, гульняў, дзякуючы меркаванням іншых і параўнанню асобай уласных якасцей і дзеянняў з аналагічнымі здаровай у маральных адносінах асобы і іншых дастойных людзей.

**Маральнае мысленне** – наступны этап фарміравання маральнага здароўя асобы, цесна звязаны з папярэднім, што дапамагае планаванню і прадугледжванню вынікаў уласных дзеянняў, аналізу паступаючай звонку маральнай "інфармацыі", планаванню асабістых дзеянняў, учынкаў, стылю паводзін, падвядзенню высноў.

**Маральныя паводзіны** з'яўляюцца наступным этапам пасля маральнага мыслення. Яны складаюцца з маральных учынкаў-дзеянняў, што характарызуюцца сваёй усвядомленасцю і абдуманасцю. Характэрная асаблівасць маральных паводзін – наяўнасць маральнага ўзору (своеасаблівага ацэначна-арыенціровачнага комплексу, які ўключае ў сябе канкрэтныя акты паводзін, іх ацэнку, а таксама веды пра мэту і сэнс дадзеных паводзін), які фарміруецца і папаўняецца, дзякуючы зносінам з іншымі людзьмі, дзецьмі. Устойлівыя маральныя паводзіны фарміруюцца, дзякуючы пераадоленню знешніх (паміж існуючымі ў грамадстве ці калектыве нормамі паводзін і ўласнымі паводзінамі) і ўнутраных супярэчнасцей (паміж новымі маральнымі

ўяўленнямі і паняццямі і маральнымі перакананнямі асобы, паміж маральнай свядомасцю і паводзінамі; паміж прэтэнзіямі асобы і яе магчымасцямі).

**Маральная воля** абумоўлівае свядомую дзейнасць чалавека, таму яе магчыма разглядаць як працэс, які мае месца на ўсіх этапах фарміравання маральнага здароўя асобы. Дадзены працэс пачынаецца з узнікнення пабуджэння, якое пераходзіць у імкненне, затым у жаданне; наступнай прыступкай з'яўляецца пэўная арганізацыя сукупнасці жаданняў (якая прадугледжвае здольнасць рэгуляваць паводзіны праз кіраванне сваімі жаданнямі). Кожны з этапаў працэса фарміравання маральнага здароўя змяшчае шэраг умоў і сродкаў, накіраваных на фарміраванне фізічнага здароўя асобы.

**Фарміраванне фізічнага здароўя** выступае ў якасці працэса, што заклікаsuccessful зберагчы і ўмацаваць здароўе падрастаючага пакалення, які складаецца з шэрагу сацыяльных умоў і сродкаў: **рацыянальны рэжым дня**, у тым ліку працы і адпачынку (у залежнасці ад узросту дзіцяці: рэжыму сну, харчавання, рухальнай дзейнасці – асноўных кампанентаў рэжыму дня "анёлка" і "блазнюка"; рэжыму працы і адпачынку, уключаючы рацыянальнае харчаванне, аптымальны начны сон, знаходжанне на свежым паветры – для астатніх узроставых груп); **аздараўленчая фізкультура і актыўны адпачынак** (рухальная актыўнасць маленькіх дзетак, якая праяўлялася ў фізічных практыкаваннях: поўзанні, хадзьбе, бегу, скоках і г.д. - рухальная дзейнасць блазнаў: актыўныя гульні і спаборніцтвы на свежым паветры ў любую пару года, пасільныя працоўныя абавязкі; - стваральная працоўная дзейнасць падлеткаў і юнацтва і іх актыўны адпачынак: спаборніцтвы, выпрабаванні, танцы); **загартаванне** (загартаванне паветрам і сонцам, г.зн. аптымальнае знаходжанне дзіцяці на свежым паветры ў залежнасці ад узросту, воднае загартаванне – *актыўнае загартаванне*; аптымальнае апрананне – *пасіўнае загартаванне*); **рацыянальнае харчаванне** (разлічанае на пэўны ўзрост, набор прадуктаў адпавядаў рацыянальнай дыетэтыцы, захаванне агульнапрынятых правілаў сталавання; **гігіена быту** (гігіена жылля і асабістая гігіена кожнага члена сям'і, якая ўключае падтрыманне дома, хатніх рэчаў і асабістых рэчаў кожнага ў чысціні, а таксама – догляд за чысцінёй цела, пазногцяў, зубоў і ротавай поласці, валасоў кожнага члена сям'і); **станоўчая накіраванасць на непрыняцце або адмову ад шкодных звычак** (у прыватнасці "антыалкагольнае" выхаванне).

Фарміраванне фізічнага і маральнага здароўя ў беларускай народнай выхаваўчай практыцы заўсёды было ўзаемадзейным: адбывалася праз выкарыстанне агульнага комплексу сродкаў і метадаў, накіраваных на дасягненне адзінай мэты – фарміраванне маральна і фізічна здаровай асобы

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Распрацаваны гісторыка-метадалагічны падыход да вызначэння і размежавання паняццяў "народная педагогіка" і "этнапедагогіка" з улікам асаблівасцей нацыянальна-гістарычнага кантэксту. Улічваючы ўмовы нацыянальна-гістарычнага развіцця беларусаў як народнасці (з XII-XIV па XV-XVI ст.ст.), а таксама пачатак фарміравання беларускай нацыі (з другой паловы XIX – пачатку XX ст.ст.), справядліва вызначаць здабыткі выхаваўчай спадчыны і этнічнай культуры насельніцтва, што пражывала на гістарычнай тэрыторыі Беларусі ў перыяд да другой паловы XIX стагоддзя, як <u>этнічную педагогіку</u>, пад якой мы разумеем выхаваўчыя традыцыі асобнай этнічнай групы, што складваліся ў перыяд яе станаўлення. Пачынаючы з другой паловы XIX стагоддзя (гістарычнага пачатку фарміравання беларускай нацыі) народную педагагічную спадчыну неабходна іменаваць <u>беларускай народнай педагогікай</u>. Дадзенае паняцце, якое з'яўляецца аб'ектам нашага даследавання, зыходзячы з уласных даследчыцкіх пазіцый, ёсць бесперапынны працэс стварэння, удасканалення і перадачы ў спадчыну педагагічных ідэй і выхаваўчай практыкі беларускага народа, занатаваных у яго народнай творчасці [14].

2. Удасканалены і пададзены ў цэласным выглядзе характэрны для беларускага народа к.XIX–п.XX ст.ст. ідэал маральна і фізічна здаровай асобы. Гістарычны аналіз асноўных якасцей нацыянальнага ідэалу, сведчыць, што на працягу стагоддзяў уяўленні беларусаў аб "дасканалым чалавеку" узбагачаліся ўсё новымі і новымі гранямі, якія знаходзіліся ў суаднесенасці з фарміраваннем менталітэту беларусаў. На перыяд к.XIX – п.XX ст.ст., з улікам гістарычных, геапалітычных, прыродна-геаграфічных умоў Беларусі, а таксама асаблівасцей развіцця нацыянальнай псіхалогіі беларусаў, а гэта значыць і менталітэту народа, склаліся спрыяльныя перадумовы для пачатку фарміравання беларускай нацыі з уласцівымі для яе нацыянальна вызначанымі рысамі характару. Сукупны ідэал маральна і фізічна здаровай асобы ўключае ў сябе найбольш адметныя рысы: працавітасць, патрыятызм, гуманізм, дабрыню, чэснасць і праўдзівасць, сумленнасць, павагу да людзей, гонар і ўласную годнасць, фізічную моц і вытрымку, упэўненасць, справядлівасць. Доказнасць і аргументаванасць вылучэння вышэйзгаданага ідэалу вызначаецца прымяненнем гісторыка-метадалагічнага падыходу да вывучэння навуковай спадчыны беларускіх асветнікаў к.XIX–п.XX ст.ст.: М.Доўнар-Запольскага, Я. Коласа, Я. Лучыны, І.Сербава, Цёткі, - а таксама мэтанакіраванага аналізу вуснай народнай творчасці беларусаў: прыказак, прымавак і фразеалагізмаў, казак, песень, міфаў і паданняў, анекдотаў і жартаў [2, 9, 10, 16, 17].

3. Вызначана нацыянальная адметнасць сродкаў і метадаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы, што дазволіла распрацаваць іх аўтарскую класіфікацыю. Народна-педагагічныя сродкі аб'яднаны ў два блокі ў залежнасці ад выхаваўчага накірунку: сродкі практычнага блоку (праца, гульня) – з маленства прывучаюць асобу, што фарміруецца, да выканання ўсіх этычных правілаў і норм, прынятых у грамадстве, а таксама да мэтанакіраванай штодзённай фізічнай падрыхтоўкі; сродкі моўнага падблоку этнакультурнага блоку (казкі, міфы і паданні, прыказкі, прымаўкі і фразеалагізмы, песні, пацешкі і забаўлянкі, анекдоты і жарты) – славесна ўздзейнічаюць на свядомасць выхаванца, даносячы да яго маральны і фізічны ідэал асобы або яго рысы,

таксама падаюць спосабы выпрацоўкі рыс дадзенага ідэалу; сродкі традыцыйна-побытавага падблоку этнакультурнага блоку (звычаі і традыцыі) – далучаючы да традыцыйных для беларускага народа звычаяў і святаў, спрыяюць фарміраванню маральна і фізічна здаровай асобы. Народна-педагагічныя метады раскласіфікаваны па прымеце выходнай ініцыятывы (вылучана на аснове аналізу напрамкаў уздзеяння на асобу, што фарміруецца: акружэннем асобы, уласна асобай) на наступныя групы: метады ініцыятывы "акружэнне "Я" (прыклад і аўтарытэт, наказ, благаславенне, перакананне, парада, прывучэнне, унушэнне, тлумачэнне, расповед, грамадская думка, ушчуванне, заахвочванне, ухваленне, асуджэнне, вымова, пакаранне, пагроза, праклён) – дапамагаюць асобе, што фарміруецца, усвядоміць значнасць рыс маральнага і фізічнага ідэалу, сфарміраваць станоўчыя адносіны да іх; спрыяюць фарміраванню дадзеных рыс; метады ініцыятывы "Я" (назіранне; самаўнушэнне, самаперакананне, самапрывучэнне, самазаахвочванне, самаўшчуванне, самаўхваленне, самаасуджэнне, самапакаранне) – дапамагаюць асобе свядома кіраваць працэсам фарміравання ўласнага маральнага і фізічнага здароўя; метады ўзаемнай ініцыятывы (праца, гульня, іспыт, практыкаванне, гутарка, спаборніцтва) – асаблівыя тым, што асоба і яе акружэнне (сям'я, сябры, суседзі, вяскоўцы і інш.) агульнымі намаганнямі ажыццяўляюць практычную шліфоўку выхаванцам рыс маральнага і фізічнага ідэалу асобы. Фарміраванне маральнага здароўя асобы беларусаў ёсць паслядоўны працэс, які складаецца з наступных узаемазвязаных этапаў: 1) фарміраванне маральнай свядомасці (маральных уяўленняў і паняццяў, маральных пачуццяў, маральнай ацэнкі) – адлюстраванне ў свядомасці чалавека прынцыпаў маральнасці, г.зн. норм паводзін, што рэгулююць адносіны людзей адзін да аднаго і ў цэлым да грамадства; 2) фарміраванне маральнага мыслення – дазваляе прадугледзець загадзя вынікі маральных дзеянняў і паводзін асобы, дае магчымасць загадзя планаваць асобе маральную дзейнасць, адносіны да іншых людзей; 3) фарміраванне маральных паводзін, якія складваюцца з маральных учынкаў-дзеянняў, што ўспрымаюцца і ўсведамляюцца самім дзеючым суб'ектам як грамадскі акт, як праяўленне маральных адносін гэтага чалавека да іншых людзей; 4) фарміраванне маральнай волі – свядомае рэгуляванне чалавекам сваіх маральных паводзін і дзейнасці, выяўленае ім ва ўменні пераадольваць унутраныя і знешнія цяжкасці пры выкананні мэтанакіраваных маральных дзеянняў і ўчынкаў (адбываецца на кожным з этапаў фарміравання маральнага здароўя асобы). Працэс фарміравання фізічнага здароўя асобы скіраваны на захаванне і ўмацаванне здароўя дзіцяці, дадзенага яму ад нараджэння пад уплывам спадчыннасці, умоў працякання цяжарнасці будучай маці, мерапрыемстваў па асептыцы падчас прыняцця родаў. Захаваць і прымножыць здароўе дзіцяці ва ўсе часы былі заклікаваны наступныя сродкі: 1) рацыянальны рэжым дня, у тым ліку працы і адпачынку – захаванне "дынамічнага стэрэатыпу", а таксама тыповых складаемых рэжыму дня: дзейнасці, рацыянальнага чаргавання працы і адпачынку, рэгулярнага харчавання, заняткаў мэтанакіраванай рухальнай нагрузкай, знаходжанне на свежым паветры, строгага захавання гігіены сну; 2) аздараўленчая фізкультура і актыўны адпачынак – рухальная актыўнасць, фізічныя практыкаванні, спаборніцтвы, танцы, выпрабаванні, стваральная працоўная дзейнасць; 3) загартаванне – актыўнае: загартаванне сонцам, паветрам і вадою – і пасіўнае: рацыянальнае апрананне; 4) рацыянальнае харчаванне - захаванне агульнапрынятых

правілаў сталавання: харчаванне ў строга азначаныя часы, захаванне пэрагу традыцыйных спосабаў і норм паводзін за сталом, паслядоўнасць у спажыванні страў і г.д.; 5) гігіена асабістая і гігіена быту – падтрыманне дома, хатніх і асабістых рэчаў у чысціні, догляд за чысцінёй цела, пазногцяў, зубоў і ротавай поласці, валасоў кожнага члена сям'і; 6) непрыняцце альбо адмова ад шкодных звычак – характар выканання якіх ускладняўся ў адпаведнасці з узроставымі крытэрыямі [1-6, 8, 11-16].

4. Узаемасувязь працэсаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы выяўляецца ў: агульным для дадзеных працэсаў народна-педагагічным ідэале маральна і фізічна здаровай асобы; агульным спектры народна-педагагічных сродкаў і метадаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы; узаеманакіраваным характары працэсаў, што вызначана наяўнасцю элементаў фарміравання фізічнага здароўя асобы ў працэсе фарміравання маральнага здароўя асобы і, адпаведна, прысутнасцю кампанентаў фарміравання маральнага здароўя ў працэсе фарміравання фізічнага здароўя асобы. Працэсы фарміравання маральнага і фізічнага здароўя былі непарыўнымі і ажыццяўляліся адначасова: фарміраванне маральнага здароўя дзіцяці адбывалася і ў працоўнай дзейнасці, і ў гульнях, і падчас захавання рэжыму дня, харчавання, гігіены праз фарміраванне акуратнасці, ашчаднасці, стараннасці, працавітасці, што з'яўляюцца неад'емнымі якасцямі маральна здаровай асобы; фарміраванне фізічнага здароўя мела месца пры фарміраванні ў дзіцяці пэўных маральных уяўленняў, маральных пачуццяў пра справядлівасць, таварыскасць і калектывізм; ацэнкі дзеянняў і ўчынкаў іншых людзей і ўласных, уласных здольнасцей, перакананняў і спосабу паводзін у грамадстве; маральных паводзін, што павінны характарызавацца сваёй гуманнасцю, справядлівасцю, патрыятычнасцю, прымяненнем фізічнай моцы ў карысных для грамадства або сям'і мэтах: імкнення дапамагчы таму, хто слабейшы або маладзейшы за цябе, каму неабходна твая дапамога [16].

5. Вырашэнне праблемы фарміравання маральнага і фізічнага здароўя падрастаючага пакалення беларусаў магчыма пры звяртанні сучасных адукацыйных устаноў Беларусі да нацыянальных вытокаў і стратэгічным выкарыстанні выхаваўча-аздараўленчага патэнцыялу беларускай народнай педагогікі ў планаванні і рэалізацыі выхаваўчага працэсу. Фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя асобы ў сучасных вучэбна-выхаваўчых умовах будзе дзейным пры выкананні наступных, гістарычна абгрунтаваных і нацыянальна вызначаных, умоў: *па-першае*, выбар выхаваўчых арыенціраў павінен ажыццяўляцца згодна са спецыфікай нацыянальнага характару і ментальнасці беларускага народа, а таксама з улікам агульнанароднага маральнага і фізічнага ідэалу, трансфармаванага з улікам сучасных выхаваўчых умоў, каштоўнасных арыентацый, ментальных якасцей адпаведнага соцыума (бо фарміраванне беларускай нацыі немагчыма без апоры на нацыянальна-гістарычныя здабыткі нашых продкаў, беларускі фальклор як крыніца ведаў пра ідэал маральна і фізічна здаровай асобы адлюстроўвае не толькі мінулае, але і тыя каштоўнасці, якія яшчэ павінны рэалізавацца); *па-другое*, шырокае выкарыстанне сродкаў і метадаў беларускай народнай педагогікі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе навучальных устаноў, сямейным і грамадскім выхаванні (пры спецыяльнай падрыхтоўцы будучых педагогаў; праз метадычнае кансультаванне бацькоў; праз правядзенне тэматычных лекцый для шырокага кола грамадскасці); *па-трэцяе*, планаванне здаровага ладу

жыцця сучаснай асобы пры выкарыстанні беларускіх народных традыцый фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы; планаванне і фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя падрастаючага пакалення ва ўзаемадзеянні (у працы паказаны магчымасці іх спалучэння праз навукова-тэарэтычнае, гісторыка-метадалагічнае абгрунтаванні, наглядна ў выглядзе табліц і логіка-структурных схем, а таксама пададзены шэраг неабходных сродкаў і шляхоў фарміравання маральна і фізічна здаровай асобы, якія працяглы час паспяхова выкарыстоўвалі і ўдасканальвалі нашы продкі [1, 4, 11, 13-16].

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДАСЛЕДАВАННЯ


***Артыкулы ў часопісах***

1. Міхайлава А.Л. Фарміраванне маральнага здароўя асобы// Народная асвета. – 2001. – № 12. – С. 50-52.
2. Міхайлава А.Л. Педагагічная значнасць казачнага эпасу беларусаў// Пачатковая школа. – 2002. - № 4. – С.20-22.
3. Міхайлава А.Л. Ідэі народнай педагогікі як крыніца фарміравання фізічнага здароўя асобы// Здаровы лад жыцця. – 2003. - №6. – С.12-14.
4. Міхайлава А.Л. Фарміраванне маральных паняццяў сродкамі беларускай народнай педагогікі// Пачатковая школа. – 2005. - №11. – С.6-9.
5. Міхайлава А.Л. Метады фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы// Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта. – 2006. - №3. – С.15-18.

***Матэрыялы і тэзісы дакладаў навуковых канферэнцый***

6. Міхайлава А.Л. Еднасць ідэй фарміравання маральнага і фізічнага здароўя падрастаючага пакалення ў казачным эпасе беларусаў і палякаў// Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія. Матэрыялы 5 міжнароднай навуковай канферэнцыі. – Віцебск. – 2000. – С.164-165.
7. Міхайлава А.Л. Падабенства маральнага і фізічнага ідэалу беларускага, рускага і ўкраінскага народаў, занатаванага ў казачным эпасе//Беларусь и Европа: взаимодействие культур (история, уроки, опыт, современность). Материалы международной научно-практической конференции. – Витебск. – 2000. – С.288-289.
8. Міхайлава А.Л. Агульныя ідэі выхавання падрастаючага пакалення, занатаваныя ў беларускіх і англійскіх народных прыказках і прымаўках// Германский и славянский миры: взаимовлияние, конфликты, диалог культур (история, уроки, опыт, современность). Материалы международной научно-теоретической конференции. – Витебск. – 2001. – С.395-398.
9. Міхайлава А.Л. Адлюстраванне маральнага ідэалу ў беларускай народнай песні// Мир искусства и дети: проблемы художественной педагогики. Материалы 2 международной научно-практической конференции. – Витебск. – 2001. – С.140-141.
10. Міхайлава А.Л. Адлюстраванне рыс маральнага і фізічнага ідэалу чалавека ў беларускай народнай педагогіцы// Наука и образование в

условиях социально-экономической трансформации общества. Сборник докладов международной научной конференции. – Витебск. – 2001. – С.370-372.

11. Міхайлава А.Л. Магчымасці маральнага і фізічнага аздараўлення сельскіх школьнікаў праз выкарыстанне ідэй і сродкаў народнай педагогікі беларусаў// Общеобразовательная школа в условиях реформирования: состояние и перспективы. Материалы Международной научно-практической конференции. – Витебск. – 2002. – С.153-155.

12. Михайлова Е.Л. Психологические особенности воздействия общественной мысли в народной педагогике белорусов на формирующуюся личность// Гуманизация и духовность в образовании и воспитании: Материалы научно-практической конференции. – Смоленск. – 2002. – С.53-57.

13. Міхайлава А.Л. Роля сродкаў і метадаў народнай педагогікі пры асваенні маральных паняццяў як аднаго з этапаў фарміравання маральнай свядомасці асобы// Новые технологии в современном процесссе обучения. Материалы 1 республиканской научно-практической конференции. – Новополоцк. – 2003. – С.114-117.

14. Міхайлава А.Л. Роля вывучэння этнакультурнай спадчыны беларусаў у працэсе падрыхтоўкі будучых педагогаў// Профессиональная подготовка специалистов социальной и образовательной сфер в условиях трансформации современного общества: проблемы и перспективы. Материалы международной научно-практической конференции. – Витебск. – 2005. – С.253-255.

15. Міхайлава А.Л. Роля народна-педагагічных сродкаў і метадаў у фарміраванні маральных пачуццяў студэнтаў// Социально-психологические и гуманитарные аспекты интеграции культур в условиях трансформации современного общества. Материалы международной научно-практической конференции студентов и молодых ученых. – Витебск. – 2005. – С.216-218.

***Вучэбна-метадычны дапаможнік***

16. Міхайлава А.Л. Узаемадзеянне працэсаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы / Народная педагогіка. Вучэбна-метадычны дапаможнік/ Арлова Г.П.. Т.Д.Вакушэнка, А.Л.Міхайлава, С.Р.Тубалец; Пад агульнай рэд. Г.П.Арловай. – Віцебск: Выд-ва УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2006. – 128 с. – С. 77-107.

17. Арлова Г.П., Міхайлава А.Л. Народная педагогіка ў педагагічнай спадчыне вядомых педагогаў / Народная педагогіка. Вучэбна-метадычны дапаможнік/ Арлова Г.П., Т.Д.Вакушэнка. А.Л.Міхайлава, С.Р.Тубалец: Пад агульнай рэд. Г.П.Арловай. – Віцебск: Выд-ва УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2006. – 128 с. – С. 35-42.

# РЕЗЮМЕ

**Михайлова Елена Леонидовна**

**Формирование нравственного и физического здоровья личности в белорусской народнай педагогике: историко-методологический аспект**

**Ключевые слова:** здоровый образ жизни, здоровье, личность, народная педагогика, нравственно здоровая личность, нравственное здоровье, физически здоровый ребенок, физическое здоровье, формирование, формирование нравственно здоровой личности, нравственное мышление, нравственное поведение, нравственное сознание.

**Объект исследования:** белорусская народная педагогика.

**Предмет исследования:** формирование нравственного и физического здоровья личности в белорусской народной педагогике.

**Цель исследования:** на основе анализа фольклорных, этнокультурных, историко-архивных источников и научной литературы по проблеме исследования определить и охарактеризовать пути и средства формирования нравственного и физического здоровья личности в белорусской народной педагогике, а также проследить взаимосвязь данных процессов.

**Методы исследования:** описательно-аналитический, сравнительно-исторический, теоретический: сравнительный анализ и обобщение философских, валеологических, педагогических, этнопедагогических, народно-педагогических, этнографических сведений в контексте темы исследования.

**Научная новизна результатов исследования.**

Впервые в отечественной истории педагогики разработан историко-методологический подход и учтена национально-историческая специфика понятий «народная педагогика» и «этнопедагогика»; показаны возможности применения воспитательно-оздоровительного потенциала белорусской народной педагогики; раскрыта взаимосвязь процессов формирования нравственного и физического здоровья личности в белорусской народной педагогике, которая проявляется через: характерный для белорусов ***совокупный идеал нравственно и физически здоровой личности***, выделенный на основании рассмотрения педагогических взглядов, теорий, предположений известных белорусских просветителей к.XIX – н.XX в.в., а также целенаправленного анализа устного народного творчества; общую ***систему народно-педагогических средств и методов*** формирования нравственного и физического здоровья личности (представлены их авторские классификации); ***взаимонаправленный характер*** процессов ***формирования нравственного и физического здоровья личности*** в белорусской народной педагогике, которые включают характерные пути и средства.

**Практическая (экономическая, социальная) значимость результатов исследования.** Результаты исследования возможно использовать в области формирования нравственного и физического здоровья личности в системе непрерывного образования и воспитания: в семейном воспитании, самовоспитании, в учебно-воспитательном процессе, в системе повышения квалификации педагогов.

## РЭЗЮМЭ

**Міхайлава Алена Леанідаўна**

**Фарміраваннс маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы: гісторыка-метадалагічны аспект**

**Ключавыя словы:** асоба, здаровы лад жыцця, маральна здаровая асоба, маральнае здароўе, маральнае мысленне, маральныя паводзіны, маральная свядомасць, народная педагогіка, фарміраванне, фарміраванне маральна здаровай асобы, фізічна здаровае дзіця, фізічнае здароўе.

**Мэта даследавання:** на аснове аналізу фальклорных, этнакультурных, гісторыка-архіўных крыніц і навуковай літаратуры па праблеме даследавання выявіць і ахарактарызаваць шляхі і сродкі фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы, а таксама прасачыць узаемасувязь дадзеных працэсаў.

**Аб'ект даследавання:** беларуская народная педагогіка.

**Прадмет даследавання:** фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы.

**Метады даследавання**: апісальна-аналітычны, параўнальна-гістарычны, тэарэтычны: параўнальны аналіз і абагульненне філасофскіх, валеалагічных, педагагіч-ных, этнапедагагічных, народна-педагагічных, этнаграфічных звестак у кантэксце тэмы даследавання.

**Навуковая навізна і тэарэтычная значнасць вынікаў даследавання.**

Упершыню ў айчыннай гісторыі педагогікі распрацаваны гісторыка-метадалагічны падыход і ўлічана нацыянальна-гістарычная спецыфіка паняццяў “народная педагогіка” і “этнапедагогіка”; паказаны магчымасці прымянення выхаваўча-аздараўленчага патэнцыялу беларускай народнай педагогікі; раскрыта ўзаемасувязь працэсаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы, якая выяўляецца праз: характэрны для беларусаў ***сукупны ідэал маральна і фізічна здаровай асобы***, вылучаны на падставе разгляду педагагічных поглядаў, тэорый, меркаванняў вядомых беларускіх асветнікаў к.XIX – п.XX ст.ст., а таксама мэтанакіраванага аналізу вуснай народнай творчасці беларусаў; агульную ***сістэму народна-педагагічных сродкаў і метадаў*** фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы (прадстаўлены іх аўтарскія класіфікацыі); ***узаеманакіраваны характар*** працэсаў ***фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы*** ў беларускай народнай педагогіцы, што ўключаюць характэрныя шляхі і сродкі.

**Практычная (эканамічная, сацыяльная) значнасць вынікаў даследавання.** Вынікі даследавання магчыма выкарыстоўваць у галіне фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы сістэмы бесперапыннай адукацыі і выхавання: у сямейным выхаванні, самавыхаванні, у вучэбна-выхаваўчым працэсе; у сістэме павышэння кваліфікацыі педагогаў.

## SUMMARY

Alena L. MIKHAILAVA

# FORMATION OF MORAL AND PHYSICAL HEALTH OF THE PERSONALITY IN BELARUSIAN FOLK PEDAGOGICS: HISTORICAL AND METHODOLOGICAL ASPECT

**Key words**: healthy life-style, health, personality, folk pedagogics, moral personality, moral health, physical health, formation, moral thinking, moral behaviour, moral consciousness.

Belarusian folk pedagogics makes up **the object of** the research. **The subject** of the research is formation of moral and physical health of the personality in Belarusian folk pedagogics.

**The aim** of the research is to determine and to analyze ways and means of formation of moral and physical health of the personality in Belarusian folk pedagogics on the basis of the analysis of folklore, ethno cultural, historical and archival sources and the scientific literature on the issue under research, and to find out the interrelation of these processes.

**Research methods**: descriptive and analytical method, comparative and historical method, theoretical analysis: comparative analysis and synthesizing of philosophical, valeological, pedagogical, ethno pedagogical, folk pedagogical, ethnographic data in the frame of the matter under research.

**The scientific novelty of the data obtained**. For the first time the realization of folk pedagogics ideas in working out the issues of formation of moral and physical health of the personality by Belarusian enlighteners at the end of the $19^{th}$ century – the beginning of the $20^{th}$ century is shown; it is established that the interrelation of the processes in the formation of moral and physical health of the personality in Belarusian folk pedagogics is revealed through the following: the general ideal of the moral and physically healthy personality whose qualities are singled out from Belarusian folklore; the general system of folk pedagogical means and methods of formation of moral and physical health of the personality; the interdirectional nature of the processes mentioned above which include priority means and ways. The classification of folk pedagogical means is given, as well as the classification of Belarusian folk pedagogics methods aimed at formation of the moral and physically healthy personality and grouped on the basis of the proceeding initiative.

**Significance (economic, social) and the area of application.** The results obtained can be used in the system of lifelong education and upbringing, in family education, self-education, in the kindergartens and at schools, when training students for delivering lectures and conducting seminars in ethnopedagogics, and in the system of advanced and further training.

